# Дзіцячы атлас Беларусі

## ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ





*Помнік князю Альгерду*



*Руіны Навагрудскага замка*



*Помнік Кірылу Тураўскаму*











# Дзіцячы атлас Беларусі

## ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2018





УДК 087.5 : 908(476)
ББК 26.89(4Беи)
Д43

Тэкст, укладанне **Дзмітрыя Пятровіча**

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе
і пры фінансавай падтрымцы
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**ISBN 978-985-02-1870-4**

© Афармленне. УП «Мастацкая літаратура», 2018

Мінск 4





## Брэсцкая вобласць

Брэст 6
Камянец 8
Лунінец 10
Ляхавічы 12

## Віцебская вобласць





Віцебск 15
Браслаў 16
Полацк 18
Орша 20





## Гомельская вобласць

Гомель 23
Добруш 24
Рагачоў 26
Тураў 28

## Гродзенская вобласць





Гродна 31
Гальшаны 32
Мір 34
Навагрудак 36





## Магілёўская вобласць

Магілёў 39
Бялынічы 40
Клімавічы 43
Крычаў 44

## Мінская вобласць





Заслаўе 47
Капыль 49
Клецк 51
Нясвіж 53
Узда 55

# Мінск



КАФЕДРАЛЬНЫ САБОР САШЭСЦЯ СВЯТОГА ДУХА



НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА

Мінск



ЧЫРВОНЫ КАСЦЁЛ

ПОМНІК МАКСІМУ БАГДАНОВІЧУ





НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА

Калісьці вельмі даўно на рацэ Свіслач стаяў вялікі вадзяны млын. А пабудаваў яго волат-чараўнік Менеск. Хадзілі чуткі, што асілак Менеск не збожжа малоў на тым млыне, а каменне пераціраў на муку.



ПОМНІК ЯКУБУ КОЛАСУ



ДОМ-МУЗЕЙ ВАНЬКОВІЧАЎ



МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

Уначы ездзіў ён па навакольных вёсках і збіраў дружыну з дужых і смелых людзей, каб бараніць родную зямлю ад ворагаў.

З цягам часу каля млына пачалі сяліцца людзі. Потым на тым месцы вырас вялікі прыгожы горад, які назвалі Менеск. Пазней яго перайменавалі ў Мінск.



ПОМНІК ЯНКУ КУПАЛУ

# Брэсцкая вобласць



СВЯТА-МІКАЛАЕЎСКІ САБОР



АСАБНЯК (ВУЛ. МІЦКЕВІЧА, 26)






БРЭСЦКАЯ КРЭПАСЦЬ (ХОЛМСКІЯ ВАРОТЫ)

## Брэст

Кажуць людзі, што калісьці даўно праз палескія балоты ехаў на возе купец. Ён накіроўваўся ў Літву, каб выгадна прадаць свой тавар. Змарыўся купец ад доўгай дарогі ды і задрамаў. Калі



ГАРАДЗІШЧА



ПОМНІК
У ГОНАР
1000-ГОДДЗЯ
БРЭСТА



СВЯТА-МІКАЛАЕЎСКАЯ БРАЦКАЯ ЦАРКВА

расплюшчыў вочы, раптам адчуў, што воз пад ім правальваецца ў балота. Непадалёк раслі бярозкі. Купец саскочыў з воза і пачаў здзіраць са ствалоў бяросту і сцяліць яе пад колы. Потым схапіў пугу ды так хвастануў каня, што той ірвануў воз і выцягнуў яго на сухое месца.

Калі купец вяртаўся з Літвы, ён пабудаваў тут капліцу. Даведаўшыся пра каплічку «на бярэсце», сюды пацягнуліся людзі. Рукавы ракі Мухавец былі для паломнікаў як натуральныя абарончыя равы. І людзі пабудавалі на тым месцы горад, якому далі назву Берасце. Цяпер мы ведаем яго як Брэст.

# Камянец

Калі спытаць у любога беларуса, які горад пабудаваны на камянях, той, напэўна, адразу адкажа: «Камянец». Сапраўды, пра гэтыя мясціны гавораць, што зямля тут каменная.

У старажытныя часы, як кажуць людзі, тут жыў Цар-змей — чалавек са змяінай галавой. Домам ягоным быў вялізны валун з вокнамі і дзвярыма. Але заняты Цар-змей быў зусім не царскай справай — шыў вопратку і абутак. Па начах сядзеў ён у сваім каменным доме каля акна за сталом, на якім ярка гарэла свечка, і шыў. Ды гора было таму, хто прабіраўся цішком да асветленага акенца, каб паглядзець, што робіць Цар-змей. Калі чалавек зазіраў у пакой, то адразу ператвараўся ў камень. Таму вакол дома Цара-змея ляжала шмат камянёў.




Аднойчы Цар-змей убачыў прыгожую дзяўчыну і закахаўся ў яе. Цёмнай ноччу выйшаў ён са свайго каменнага дома, каб да раніцы прасядзець каля хаты, дзе жыла дзяўчына (і, можа, нават убачыць яе!). Але пачалася навальніца, бліснула маланка і забіла Цара-змея. Людзі пахавалі яго каля дома-валуна.

Праз нейкі час на гэтай камяністай зямлі вырас горад, якому далі назву Камянец.


ПОМНІК ДОЙЛІДУ АЛЕКСУ
БУДЫНАК БЫЛОГА МЛЫНА
КАМЯНЕЦКАЯ ВЕЖА
ЦАРКВА СВЯТОГА СІМЯОНА

# Лунінец

З даўніх часоў вядома на Беларусі вёска Лунін. Калісьці адзін мясцовы жыхар — лунінец — з нейкай прычыны вырашыў аддзяліцца ад сваякоў. Непадалёк ад вёскі ён пабудаваў хату, абнёс агароджай новы ўчастак, узараў там зямлю, завёў гаспадарку. Хутар, дзе пасяліўся чалавек з Луніна, людзі назвалі Лунінцам. З часам у гэтага чалавека і ягонай жонкі нарадзіліся дзеці. Потым пайшлі ўнукі. Ствараліся новыя сем'і. Усе яны сяліліся непадалёк ад хутара, будавалі хаты, заводзілі гаспадарку. Паступова на гэтым месцы вырасла вёска, а праз нейкі час — і горад, назва якога захавалася і цяпер — Лунінец.



ПОМНІК ДА 120-ГОДДЗЯ ПАЛЕСКІХ ЧЫГУНАК





КАСЦЁЛ СВЯТОГА ІОСІФА



ПОМНІК АВІЯКАНСТРУКТАРУ ПАЎЛУ СУХОМУ


РАЁННЫ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ
ХРАМ ІКОНЫ БОЖАЙ МАЦІ
Лунінец
СВЯТА-КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА

# Ляхавічы

Вельмі даўно гэта было. Калі памёр стары князь, засталіся ў яго дзеці — трое сыноў і тры дачкі, і трэба было вырашыць, хто з іх узыдзе на княжацкі трон і будзе правіць у Старых Ляхавічах.

Раніцай сабралася веча (сход). Трое маладых княжычаў спачатку выхапілі мячы, каб біцца паміж сабой і адстаяць — кожны сваё — права на княжанне. Але іх спыніла малодшая сястра, княжна Алена, якая хацела, каб усё было вырашана мірна. Тады веча прапанавала, каб Алена выбрала сабе мужа і ўзышла на княжацкі трон. Князёўна пакланілася народу і прамовіла:

— Я згодна стаць вашай княгіняй. А мужа мне ўкажа Збавіцель.— І яна загадала слугам: — Ідзіце за раку на пашу і паглядзіце, хто ідзе там за плугам. Сэрца падказвае мне, што гэта мой нарачоны, мне кроўны, па волі Бога мне роўны. Ён і будзе вашым князем...

Кінуліся слугі па мосце цераз раку і бачаць: ідзе па чорнай пашы за плугам



МЕМАРЫЯЛЬНАЯ КАПЛІЦА НА МЕСЦЫ ЎЗАРВАНАГА ХРАМА ЎЗВІЖАННЯ СВЯТОГА КРЫЖА



КАСЦЁЛ СВЯТОГА ІОСІФА




малады русавалосы араты і песню спявае. Паведамілі слугі хлопцу волю княгіні і прывялі яго ў замак.

Згулялі вяселле княгіня Алена і князь Яраслаў. Доўга і шчасліва жылі яны, правілі справядліва, даўшы пачатак новай дынастыі. Іх старэйшая дачка потым выйшла замуж за літоўскага князя і нарадзіла шасцярых сыноў. Малодшага звалі Міндоўг. Ён стаў першым вялікім князем нашай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага.

# Віцебская вобласць



# Віцебск

Калісьці даўно бруіла тут крынічка з чысцюткай гаючай вадой, якая дапамагала ад многіх хвароб. Аднойчы прыйшлі да гэтай крынічкі бабуля з унучкай. Дзяўчынка даўно пакутавала ад цяжкай хваробы. Бабуля напаіла ўнучку крынічнай вадой, папіла сама і набрала поўную біклагу, каб узяць з сабою. Вандроўніцы прыселі адпачыць непадалёк ад крынічкі — назапасіць сіл перад дарогай.

І тут яны ўбачылі старую, якая падышла да крыніцы і пачала паласкаць у чыстай вадзе брудную бялізну.

— Што ты робіш?! — закрычала бабуля.

А старая ведзьма павярнулася да яе і зарагатала:

— Канец цяпер вашай крыніцы!

— Каб ты да сканчэння веку віцьбай вілася! – усклікнула бабуля.

Раптам ведзьма разам з крынічкай зніклі, а на гэтым месцы разлілася шырокая рака, якую назвалі Віцьбай. Пазней тут вырас горад Віцьбеск, які з часам атрымаў назву Віцебск.




КАСЦЁЛ СВЯТОЙ БАРБАРЫ



ПОМНІК КНЯЗЮ АЛЬГЕРДУ

# Браслаў

Калісьці ў краіне блакітных азёр жылі князь Дзвін і ягоная жонка княгіня Друя. І была ў іх дачка, якую звалі Дрыва.

Ішлі гады. Дрыва падрасла і стала прыгожай дзяўчынай. Шмат князёў сваталася да яе, але безвынікова. Усе прэтэндэнты не мелі столькі грошай, колькі было ў князя з княгіняй. Толькі трое князёў — пскоўскі Сноў, полацкі Брас і лукомльскі Снуд — маглі сапернічаць з Дзвінам і Друяй. Але Дрыве яны не падабаліся.



КАСЦЁЛ НАРАДЖЭННЯ ПАННЫ МАРЫІ



ЦАРКВА ЎСПЕННЯ ПРАСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ



ПАМЯТНЫ ЗНАК НА МЕСЦЫ ЗАСНАВАННЯ БРАСЛАВА



ГАРАДЗІШЧА

— Маім мужам стане самы храбры з вас,— заявіла яна.— У баі скрыжуйце вашы вострыя мячы, і тады паглядзім, хто з вас дастойны мяне.

Снуд і Сноў вырашылі, што Дрыве падабаецца Брас. Уначы яны падпільнавалі Браса, кінуліся на яго з мячамі і забілі. Але за каго з іх дваіх пойдзе замуж прыгажуня Дрыва? Князі зноў узялі ў рукі зброю і кінуліся адзін на аднаго. Снуд перамог і забіў Снова, але сам памёр ад ран. А раніцай выявілася, што яны забілі не Браса, а ягонага слугу, які вёз Дрыве падарункі ад гаспадара...

Брас тым часам паехаў у замак. Дрыва выйшла яму насустрач.

— Я згодна выйсці за цябе замуж,— сказала яна.

З пагардай паглядзеў на яе Брас і прамовіў:

— Тваё каханне, княжна, мне не патрэбна. Я і так стану тут гаспадаром.

І пайшоў да замка. Дрыва пабегла да возера і кінулася ў ваду. Не вынесла гора маці яе, Друя, і таксама неўзабаве памерла. І стары князь Дзвін не доўга пражыў на гэтым свеце...

Іх імёны цяпер жывуць у назвах рэк (Дзвіна, Друйка) і азёр (Дрывяты, Снуды, Навяты). А князь Брас заснаваў горад, які сёння называецца Браслаў.



ВОЗЕРА ДРЫВЯТЫ

Браслаў



ГІСТАРЫЧНАЯ ГАРАДСКАЯ ЗАБУДОВА

# ПОЛАЦК

Кажуць людзі, што ў старажытныя часы ў ваколіцах Полацка пастаянна адбываліся войны. Захавалася легенда пра незлічонае багацце, якое пры адступленні закапалі на ўзгорку ваяры, каб яно не трапіла ў рукі ворагаў. Трэба было запомніць гэтае месца, і таму наверх паклалі камень.



СПАСА-ЕФРАСІННЕЎСКІ МАНАСТЫР



ПОМНІК УСЯСЛАВУ ЧАРАДЗЕЮ



САФІЙСКІ САБОР



СТЭЛА Ў ГОНАР ГЕРОЯЎ ВАЙНЫ 1812 г.

Прайшло шмат гадоў. Пра гэтую гісторыю пачулі некалькі полацкіх хлопцаў, якія вырашылі знайсці скарб. Ноччу сябры, прыхапіўшы з сабой рыдлёўкі, адправіліся за горад. Знайшоўшы той камень на вялікім узгорку, яны абкапалі валун з усіх бакоў, а потым асцярожна адсунулі ўбок. Капалі паўночы. Неўзабаве рыдлёўка стукнулася аб жалеза.

— Ура, золата! — радасна закрычалі хлопцы.

Прыгледзеўшыся, яны ўбачылі, што гэта не кацёл з грашыма, а цяжкі жалезны панцыр. Ён пакрываў грудзі шкілета, побач з якім ляжаў меч, а на чэрапе быў жалезны шалом.

Самы смелы з сяброў прапанаваў:

— Давайце нічога чапаць не будзем, а возьмем на памяць гэты меч. Няўжо мы дарэмна амаль усю ноч тут капалі?

Але толькі хлопец працягнуў руку і дакрануўся да мяча, як раптам грымнуў гром, неба раскалола маланка, і хлопцы ўбачылі вялізнага асілка ў жалезным панцыры з мячом у руцэ. Асілак прамовіў:

— Нікчэмныя! Золату і срэбру прадалі вы ўсе пачуцці, толькі ў багацце ўклалі свае надзеі, не ўшанавалі прах волата, які з годнасцю скончыў тут жыццё...

Зноў грымнуў гром, бліснула маланка — і асілак знік... У святле бліскавіцы хлопцы ўбачылі засыпаную пяском магілу. Ім падалося, што на гэтым месцы зямля была некранутай...

Полацк



ПОМНІК ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ



БАРЫСАЎ КАМЕНЬ

# Орша

Калісьці даўно там, дзе зліваюцца дзве ракі, князь Орша пабудаваў вялікі замак. У князя была дачка-прыгажуня. Яна пакахала сялянскага хлопца. Па начах, калі на небе з'яўляўся месяц, закаханыя сустракаліся на беразе ракі. Але князь даведаўся пра гэта. Ягоныя слугі схапілі юнака і пакаралі смерцю. А дачку Орша пасадзіў у асобны пакой з жалезнымі кратамі на вокнах.

Ключ князь кінуў у раку, якую з таго часу сталі называць Аршыцай.

Пазней на тым месцы, дзе зліваюцца рэкі Аршыца і Днепр, паўстаў горад Орша.

ЕЗУІЦКІ КАЛЕГІУМ





БУДЫНАК БЫЛОГА ВАДЗЯНОГА МЛЫНА

ЦАРКВА СВЯТОГА ЛЕАНІДА





МЕМАРЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС «КАЦЮША»




БУДЫНАК ЧЫГУНАЧНАГА ВАКЗАЛА



ПОМНІК КАНСТАНЦІНУ ЗАСЛОНАВУ




ПАМЯТНЫ ЗНАК (ГАРАДЗІШЧА)



ПОМНІК ПАРАВОЗУ П-36



ПОМНІК ЯНКУ КУПАЛУ (ВЁСКА ЛЯЎКІ, АРШАНСКІ РАЁН)

Орша



СВЯТА-ІЛЬІНСКАЯ ЦАРКВА

# Гомельская вобласць



ЦАРКВА СВЯТЫХ ПЯТРА І ПАЎЛА



АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

Гомель



ПАЛАЦ РУМЯНЦАВЫХ-ПАСКЕВІЧАЎ



АЛЬТАНКА Ў ПАРКУ

# Гомель

Калісьці даўно жыла на свеце прыгожая дзяўчына Марыля. Бацькі не маглі нарадавацца, якая разумная і працавітая яна была!.. Аднойчы каля іх падворка з’явіўся малады багаты князь. Марылька і князь пакахалі адно аднаго.

Праз нейкі час Марыля прызналася яму:

— Хутка ў нас з табою будзе сын ці дачка.

— Дык гэта ж радасць! — усклікнуў князь. — Заўтра ж прышлю да цябе сватоў! Чакай...



Увесь наступны дзень Марыля чакала сватоў. Нарэшце настала ноч, і дзяўчына здагадалася, што ніхто да яе не прыедзе. Яна горка заплакала. Бедная Марыля вырашыла пайсці куды вочы глядзяць. Яна баялася сораму. Праз нейкі час на дарозе дзяўчына сустрэла старога жабрака, і далей яны пайшлі разам. Надыходзіла зіма, таму сярод лесу вандроўнікі пабудавалі сабе невялікую хаціну, дзе і сталі жыць. На радасць сабе і старому ў самыя лютыя маразы нарадзіла Марыля дачку, якую назвалі Мілкай.

Ішлі гады. Жабрак зусім састарэў, а Мілка падрасла і стала такой жа прыгожай, як і яе матуля. Аднойчы вясной, калі было ўжо вельмі цёпла, Мілка пайшла да ракі, каб выкупацца. Толькі адплыла яна ад берага, як трапіла ў вір. Дзед і Марыля ўбачылі гэта, але дапамагчы не змаглі... І тады, гледзячы на раку, якая адабрала ў іх самае дарагое, яны ў адзін голас закрычалі:

— Каб ты вужакай-гаміюкай круцілася!..

Раптам рака выгнулася, як змяя. З таго часу яе сталі называць Гаміюкай. Пазней на тым месцы, дзе стаяла хата Марылі, спачатку ўзнікла вёска Гомій, а потым — горад з прыгожай назвай Гомель.

# Добруш

Беларусы добра ведаюць гэтыя мясціны і называюць іх Добрушчынай. А калісьці ў далёкія часы тут было шмат лясоў. І жыў разам з жонкай і двума дзецьмі чалавек, якога звалі Добрушам. Быў ён вельмі працавітым — меў не толькі вялікую гаспадарку, але нават пабудаваў млын, дзе малоў муку. Прычым не адмаўляў у просьбе змалоць зерне ні багатым, ні бедным. Калі бедняку не было чым плаціць, Добруш малоў муку яму задарма.






РАЁННЫ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ

МЕМАРЫЯЛ У ГОНАР ЗАГІНУЛЫХ У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ







МОСТ У ПАРКУ

Слава пра дабрыню гэтага чалавека разнеслася далёка. Даведаўся пра Добруша злы чараўнік. Прыйшоў ён на млын і сказаў гаспадару:

— Мне падабаецца, як ты працуеш. З гэтага можна мець добрую капейку. Давай з табой дамовімся, што ўвесь набытак будзем дзяліць на дваіх, пароўну. А калі адмовішся — пашкадуеш...

Добруш не стаў слухаць далей і выставіў нязванага госця за дзверы.

Раззлаваўся чараўнік і наслаў на сям'ю Добруша страшэнныя хваробы. Спачатку захварэла і памерла жонка Добруша, а потым — ягоныя дзеці. Загараваў наш небарака, пасівела ягоная галава. І тут зноў падкаціўся да Добруша чараўнік. Але той, убачыўшы ліхадзея, усклікнуў:

— Лепш я скрозь зямлю правалюся, чым буду працаваць на цябе!..

Раптам грымнуў гром, бліснула маланка — і праваліўся скрозь зямлю Добруш разам са сваім млынам.

Пазней на тым месцы з'явілася спачатку вёска, а потым горад, які назвалі Добруш.

СВЯТА-МІКАЛАЕЎСКІ САБОР





ПАПЯРОВАЯ ФАБРЫКА

# Рагачоў

Жыў калісьці ў далёкія часы ваявода Рогач. Чаму так яго называлі, ніхто не ведае. Хтосьці казаў, што ягоныя ўладанні знаходзіліся дзесьці на рагу, на выгіне Дняпра. Некаторыя сцвярджалі: маўляў, ваявода біўся звычайным драўляным рагачом адразу з двума ваярамі, перамог іх і прымусіў уцякаць.

Аднойчы вяртаўся Рогач са сваёй дружынай з чарговага паходу. Набліжаўся вечар, і трэба было дзесьці спыніцца на начлег. Але на душы ваяводы было неспакойна. Чаму — ён і сам не ведаў. Тым не менш праз нейкі час яны знайшлі добрае мес-



ДОМ, ДЗЕ ЖЫЎ УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ



ГАРАДЗІШЧА

Рагачоў



ПАМЯТНЫ ЗНАК (ГАРАДЗІШЧА)



КАСЦЁЛ СВЯТОГА АНТОНІЯ ПАДУАНСКАГА

ца для лагера. Спыніліся, запалілі вогнішчы. Рогач паслаў дзясятніка з некалькімі ваярамі ў разведку. Неўзабаве тыя вярнуліся і паведамілі, што па слядах дружыны ідуць татары. Рогач сабраў сотнікаў, і яны вырашылі сустрэць ворага на пераправе.

Праз нейкі час да ракі падышло татарскае войска. Татары пачалі перапраўляцца цераз раку. Дружыннікі дачакаліся, пакуль апошні з іх вылез на бераг, і кінуліся на ворагаў. Бітва была кароткай. Шмат ваяроў загінула з абодвух бакоў, але дружыннікі Рогача перамаглі. І тут здарылася бяда: атручаная татарская страла чырканула ваяводу па твары. Спачатку ён, захоплены бітвай, амаль нічога не адчуў, але неўзабаве, зусім аслабелы, пахіснуўся і ўпаў з каня. Праз дзень Рогач памёр. Дружыннікі пахавалі ўсіх забітых, у тым ліку свайго ваяводу, і насыпалі над імі курган, які назвалі Рогачаў. Пазней тут вырас горад, назва якога і цяпер вядомая ўсім — Рагачоў.



КАПЛІЦА НА МОГІЛКАХ



СВЯТА-АЛЯКСАНДРА-НЕЎСКАЯ ЦАРКВА

# Тураў

У старажытныя часы на тым месцы, дзе цяпер знаходзіцца Тураў, былі дрымучыя лясы, а побач неслі свае воды рэкі Прыпяць, Струмень і Язда. Прыйшоў на тыя землі князь Тур з войскам. Прыйшоў таму, што тут вадзілася шмат звяроў, птушак, рыбы.

Аднойчы князь Тур лёг адпачыць на высокай гары і заснуў. Прыснілася князю, быццам ён ляжыць на вялікім возе, а навокал — гарады, ды якія прыгожыя!..

Прачнуўшыся, князь Тур зразумеў, што на гэтым месцы трэба пабудаваць вялікі горад. Будаваў



ГАРАДЗІШЧА



ЗАМЧЫШЧА

Тураў



САБОР СВЯТЫХ КІРЫЛА І ЛАЎРЭНЦІЯ



ТУРАЎСКІ КАМЕННЫ КРЫЖ

князь не абы-як: спярша насыпаў тоўсты пласт рачнога пяску; потым пачаў паліць лес і паклаў дробнага вугалю ў тры аршыны, пасля — бярозавую кару і бітыя гаршкі, затым — звярыныя косці і луску язя. І толькі потым усё гэта засыпалі зямлёй.

Так з'явіўся легендарны горад Тураў. Князь Тур таксама выкапаў глыбокі калодзеж, у якім, казалі людзі, былі тры дны: меднае, сярэбранае і залатое. І калі не вытрымае і парвецца залатое дно, то настане канец свету і Зямля зноў будзе суцэльным акіянам...

КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ



ПОМНІК КІРЫЛУ ТУРАЎСКАМУ



ЦАРКВА ЎСІХ СВЯТЫХ



# Гродзенская вобласць



# Гродна

Вельмі даўно гэта было — яшчэ ў старажытныя часы. Княжацкая дружына вярталася на чаўнах з баявога паходу. Воды вялікай ракі неслі чаўны далёка-далёка, і здавалася, што не будзе канца гэтаму падарожжу. «Трэба дзе-небудзь прыстаць да берага,— думаў князь,— і знайсці месца для лагера. А можа, і для ўмацаванага паселішча. Галоўнае, каб побач не было ворагаў...»

Паклікаўшы ваяводу, князь загадаў яму:

— Дзе Адзінец? Давай яго сюды!

Прыбег Адзінец — дужы русавалосы хлопец.

— Разам са сваімі ваярамі высаджвайся на бераг. Паглядзіце, ці няма непадалёк ворагаў, і знайдзіце месца для лагера. А калі нам тут спадабаецца, мабыць, і хаты сабе пабудуем...

Адзінец пабег да сваіх дружыннікаў.

Праз некалькі гадзін князь убачыў на беразе чалавека, які шырока развёў рукі, прыцягваючы ўвагу воінаў. Князь паклікаў ваяводу, і той растлумачыў:

— Гэта чалавек Адзінца. Ён падае нам знак, што ворагаў нідзе няма, і просіць спыніцца.

Чаўны дружна павярнулі да берага...

Неўзабаве князь з дружынай ужо абгароджвалі драўляным частаколам будучае паселішча на высокай кручы (гэтае месца паказаў ім Адзінец). Пазней, калі ў каго-небудзь з мясцовых жыхароў пыталіся, адкуль яны едуць, тыя адказвалі: «З Гародні». Праз нейкі час тут вырас горад, назва якога вядомая і цяпер — Гродна.



СТАРЫ ЗАМАК

# Гальшаны

Жыў калісьці на свеце багаты князь Альшан (ці, як яго яшчэ называлі, Ольша). Добрым і справядлівым чалавекам быў гэты князь, простых людзей ніколі не крыўдзіў. Нават найлепшы сябар у яго быў з сялян, і звалі яго Лугвен. Альшан і Лугвен разам раслі, як гаворыцца, не адзін пуд солі разам з'елі, у многіх бітвах пабывалі, разам і на паляванне ездзілі.

Аднойчы Альшан і Лугвен чарговы раз адправіліся на паляванне, але паехалі з імі толькі пяцёра ваяроў. Князь быў упэўнены, што ніхто не адважыцца напасці на яго ў тых землях, дзе ён уладарыў.

Так здарылася, што паляўнічыя, ахопленыя азартам, заехалі




СВЯТА-ГЕОРГІЕЎСКАЯ ЦАРКВА



КАСЦЁЛ СВЯТОГА ЯНА ХРЫСЦІЦЕЛЯ
І КЛЯШТАР ФРАНЦЫСКАНЦАЎ



ў глыб пушчы. Нават княжацкі палясоўшчык пачаў незадаволена азірацца па баках. Нарэшце ён не вытрымаў і звярнуўся да Альшана:

— Не гневайся, князь, на тое, што скажу табе. Лепш бы нам вярнуцца, бо я не ведаю гэтых мясцін, і мы можам заблукаць. Акрамя таго, хутка вечар, і не хацелася б, каб ноч заспела нас у лесе...

Князь Альшан не паслухаў палясоўшчыка. Паляўнічыя ўжо здабылі шмат звяроў, але ўсё адно працягвалі рухацца далей і далей. Неўзабаве яны ўбіліся ў такую глухамань, у такі гушчар, што былі вымушаны спешыцца: коні далей ісці не маглі. Князь і дружыннікі вырашылі заначаваць каля вялікага дуба. Расклалі вогнішча. Альшан звярнуўся да свайго сябра:

— Лугвен, абяцаю, што на тым месцы, дзе мы спаткаемся з людзьмі, я пабудую прыгожы замак і буду там жыць.— Князь уздыхнуў.— Хутчэй бы з гэтай пушчы выбрацца, бо страчваю я апошнюю надзею на выратаванне...

Пераначавалі паляўнічыя каля вогнішча, а раніцай рушылі далей. Доўга блукалі яны па пушчы, пакуль не ўбачылі хаціну, дзе, як выявілася, жыла сям'я другога княжацкага палясоўшчыка...

Князь Альшан выканаў сваё абяцанне, і праз два гады на месцы хаціны паўстаў вялікі прыгожы замак, каля якога вырасла паселішча з цудоўнай назвай Гальшаны.



# Мір

Было гэта ў далёкія часы. Нарадзіўся ў адной маладой сям'і сынок Мікітка. Хлопчык рос як на дражджах. У пятнаццаць гадоў ростам ён быў ужо вышэйшы за бацьку, шыракаплечы і вельмі дужы — сапраўдны асілак.

Даведаўся пра Мікіту князь і загадаў двум сваім дружыннікам, каб тыя прывезлі асілка да яго. Памчаліся ваяры праз пушчы-лясы да хутара, дзе жыў наш герой. Уся сям'я сядзела за сталом і абедала, калі ў хату ўвайшлі два воіны — плячыстыя, у кальчугах, з мячамі ў похвах. Адзін з дружыннікаў сказаў:

— Пакажыце мне асілка Мікіту!



КАПЛІЦА-ПАХАВАЛЬНЯ КНЯЗЁЎ СВЯТАПОЛК-МІРСКІХ



КАСЦЁЛ СВЯТОГА МІКАЛАЯ

Мір



ЦАРКВА СВЯТОГА ГЕОРГІЯ



ЦАРКВА СВЯТОЙ ТРОЙЦЫ

— Я тут, заходзь! — адказаў Мікіта.— Калі табе трэба — глядзі колькі хочаш!

— Дзёрзкі ты, хлопча! Паслухай мяне. Не па сваёй волі мы тут. Князь загадаў прывезці цябе. Хоча, каб ты быў у нашай дружыне.

Неўзабаве стаў Мікіта ваяром. І ў гэты ж год прыйшлі на іх зямлю ворагі. Калі два вялікія войскі сталі адно супраць аднаго (іх раздзяляла толькі невялічкая плыткая рачулка), выехаў на кані на сярэдзіну рэчкі Мікіта з мячом у руцэ.

— Гэй, вы! — крыкнуў ён ворагам.— Высылайце свайго воя-асілка! Хачу з ім біцца!

Мікіта падняў меч і з сілай апусціў яго на камень-валун, што выступаў з вады. Камень ад удару раскалоўся на дзве палавіны. Убачылі гэта ворагі і адразу паслалі перагаворшчыка, каб заключыць мір. У гонар перамогі, якую здабыў Мікіта, рэчку назвалі Мірачанкай, а паселішча, што з'явілася праз нейкі час на тым месцы, атрымала назву Мір.



МІРСКІ ЗАМАК

# Навагрудак

Калісьці даўно жыў на свеце малады і прыгожы князь Лоў. Было ў яго шасцёра братоў. Калі памёр бацька, стары князь, то за княжацкія землі, якія засталіся ў спадчыну братам, пачалася сапраўдная вайна.

Князь Лоў не захацеў ваяваць са сваімі братамі. Калі пахавалі старога князя, а над ягонай магілай насыпалі курган, Лоў і ваявода Алехна разам з дружынай адправіліся шукаць прыдатнае для жыцця месца, каб заснаваць паселішча. Доўга яны ехалі па лясах і, нарэшце, забраліся ў такую глухамань, дзе, здавалася, ніколі не ступала нага чалавека.



ПОМНІК ЕЛІСЕЮ ЛАЎРЫШАЎСКАМУ



МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА



ПОМНІК АДАМУ МІЦКЕВІЧУ

Навагрудак

ФАРНЫ КАСЦЁЛ





БАРЫСАГЛЕБСКАЯ ЦАРКВА

Каля звонкага ручая з празрыстай сцюдзёнай вадой князь з дружынай вырашылі спыніцца, каб адпачыць.

Раптам дазорныя паведамілі, што непадалёк знаходзіцца невялікая хаціна, а побач — шмат чалавечых слядоў. Князь з ваяводам адправіліся туды. Падышоўшы да хаціны, яны ўбачылі, як дзверы расчыніліся і на ганку паказалася прыгожая чорнавалосая дзяўчына.

— Як цябе завуць, прыгажуня? — спытаў князь.

— Дубраўка, — адказала яна.

— А мяне — князь Лоў. Дзе твае родныя?

— Працуюць, княжа. У нас гаспадарка вялікая... — Дзяўчына хацела яшчэ нешта сказаць, як раптам, быццам здагадаўшыся, дзеля чаго прыйшлі ваяры, дадала: — Калі вы з мірам да нас, то заставайцеся — месца ўсім хопіць.

Князь, якому Дубраўка адразу спадабалася, вырашыў застацца. Лоў з дружынай пабудавалі драўляны замак і пасяліліся ў ім. Князь Лоў і Дубраўка пакахалі адно аднаго. Неўзабаве згулялі вяселле, а праз год у іх нарадзіўся сын.

Пазней непадалёк утварылася паселішча, якое спачатку назвалі Новы Гарадок, а потым — Наваградак. Цяпер на тым месцы знаходзіцца горад Навагрудак.


ГАРА МІНДОЎГА


РУІНЫ НАВАГРУДСКАГА ЗАМКА


СВЯТА-МІКАЛАЕЎСКІ САБОР

# Магілёўская вобласць



АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР



АРХІРЭЙСКІ ПАЛАЦ



ПЛОШЧА ЗОРАК



САБОР СВЯТОГА СТАНІСЛАВА

КАФЕДРАЛЬНЫ САБОР ТРОХ СВЯЦІЦЕЛЯЎ



# Магілёў



СПАСА-ПРААБРАЖЭНСКІ САБОР

Магілёў

Калісьці даўно на ўскрайку вялікай пушчы знаходзілася вёска, дзе, як кажуць людзі, нарадзіўся асілак Машэка. Некалькі дзясяткаў мужчын нічога не маглі зрабіць супраць аднаго Машэкі — такі ён быў дужы. Машэка лёгка вырываў з зямлі разам з карэннем высокія сосны і магутныя дубы.

Але ў жыцці Машэку не пашанцавала. Некалі ў юнацтве пакахаў ён самую прыгожую дзяўчыну з іх вёскі, але тая аддала сваё сэрца багатаму князю. З таго часу Машэка раззлаваўся на ўвесь свет, забіў брата сваёй каханай і, пасяліўшыся ў лесе,



СВЯТА-МІКОЛЬСКІ МАНАСТЫР

стаў разбойнікам. Ён наводзіў жах на ўсё наваколле, пакуль зноў не сустрэў сваю каханую. Старыя пачуцці абудзіліся ў ягонай душы… Але, калі Машэка задрамаў, жанчына, каб адпомсціць за смерць брата, вострым нажом забіла яго…

Месца, дзе быў пахаваны Машэка, назвалі Магілай Льва. Пазней там спачатку з'явілася вёска, а потым вырас вялікі горад, назва якога добра вядомая ўсім — Магілёў.



КАПЛІЦА НА БУЙНІЦКІМ ПОЛІ

# Бялынічы

У старадаўнія часы, калі мангола-татары на чале з ханам Батыем наступалі на Кіеў, некалькі манахаў Кіева-Пячэрскай лаўры, каб выратавацца ад варожага нашэсця, адправіліся на лодках па Дняпры на поўнач. Яны хацелі адшукаць ціхае, спакойнае месца і заснаваць там манастыр. З сабою ў падарожжа манахі ўзялі старажытную ікону, якую лічылі сваёй заступніцай-абаронцай. Доўга плылі вандроўнікі.



ЦАРКВА МАЦІ БОЖАЙ БЯЛЫНІЦКАЙ




МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
ІМЯ ВІТОЛЬДА БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ

Аднойчы на золку манах, які глядзеў наперад, раптам закрычаў:

— Браты мае, паглядзіце туды! Тут нам трэба спыніцца!

І паказаў рукой на ўзвышша, парослае маладым лесам. А знаходзілася яно непадалёк ад таго месца, дзе зліваліся воды магутнага Дняпра і прыгажуні Друці. Манахі вырашылі выйсці на бераг і трохі адпачыць пасля шматдзённага падарожжа. Некаторыя сумняваліся: ці правільна выбрана месца для будучага манастыра?

Бялынічы

Ноччу, калі ўсе бачылі дзясяты сон, цішыню парушыў крык манаха, які стаяў на варце:



ПОМНІК-ГАРМАТА
ЎЗОРУ ЧАСОЎ ВАЙНЫ 1812 г.

— Глядзіце, браты: што гэта?!

Усе ўскочылі са сваіх месцаў і аслупянелі: манах стаяў на каленях перад старажытнай іконай, ад якой разыходзіліся такія яркія промні, што ў лесе стала светла, як удзень. Манахі зразумелі: гэта Божы знак — яны абралі добрае месца для будучага манастыра.

Для іх, як кажуць людзі, наступілі ясныя светлыя дні і белыя ночы. Адсюль і назва паселішча, якое з'явілася каля манастыра,— Беланочы, або Бялынічы.


ГІСТАРЫЧНАЯ ГАРАДСКАЯ ЗАБУДОВА
Клімавічы
СЯДЗІБНЫ ДОМ КНЯЗЁЎ МЯШЧЭРСКІХ
КРЭЙДАВЫЯ КАР'ЕРЫ

# Клімавічы

Калісьці ў даўнія часы ехалі праз нашы мясціны ажно з далёкага Пецярбурга яснавяльможныя паны. Ехалі яны карэтаю, бо аўтамабіляў тады яшчэ не было, як не было і шырокіх дарог — толькі пусткі, балоты. Вось і захрасла тады ў балоце карэта з панамі — у багну правалілася. Як ні лупцаваў вазніца пугай бедных коней, як ні рваліся тыя наперад — усё было дарэмна. Што рабіць?

Непадалёк ад таго месца на хутары жыў з сям'ёй адзін чалавек. Звалі яго Клім. Пачуў ён з боку балота крыкі людзей ды ржанне коней і



СВЯТА-МІХАЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА

кінуўся на дапамогу. Запрог двух валоў, прывязаў вяроўкай панскую карэту і за некалькі хвілін выцягнуў яе з багны. Як узрадаваліся паны!

Галоўны пан (людзі казалі, што гэта мог быць і сам цар) паклікаў нашага героя і спытаў:

— Як цябе завуць?

— Клім,— пакланіўшыся, адказаў той.

— Няхай тады на гэтым месцы будзе пабудаваны прыгожы горад! І хай называецца ён Клімавічы!

# Крычаў

Гэта было вельмі даўно, яшчэ тады, калі на абодвух берагах па-над Сожам раслі магутныя дубы. Па рацэ сплаўлялі лес. Непадалёк было паселішча. Цяжка жылося бедным людзям, горкім быў іх хлеб. З ранку да вечара працавалі яны на паноў, але атрымлівалі вельмі мала — на жыццё не хапала. Дужых хлопцаў паны бралі на працу плытагонамі.

Жыў у гэтай вёсцы ў маленькай хацінцы разам з хворай маці хлопец-асілак Ясь, які разам з сябрамі сплаўляў лес. У суседняй хаце



СТАРАЖЫТНАЕ ПАСЕЛІШЧА



СВЯТА-МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА



РУІНЫ НА ЗАМКАВАЙ ГАРЫ



ЦАРКВА ЎВАСКРЭСЕННЯ ХРЫСТОВАГА

жыла прыгожая дзяўчына Ядвіга. Ясь і Ядвіга кахалі адно аднаго і марылі пажаніцца. Але бацькі Ядвігі былі супраць: яны хацелі аддаць дачку за багатага пана.



Надакучыла жабрацкае жыццё Ясю. Сабраў ён хлопцаў-плытагонаў. Узброіліся яны косамі ды сякерамі і вырашылі прагнаць паноў, якія здзекаваліся з простых людзей. Даведаліся пра сялянскі атрад паны і задумалі расправіцца з Ясем. Ён жа, не ведаючы гэтага, пакінуў атрад у лесе, а сам з двума сябрамі прабраўся да хаты Ядвігі, каб забраць яе з сабой. Але панскія слугі схапілі іх.

Крычаў



ПАЛАЦ ПАЦЁМКІНЫХ-ГАЛЫНСКІХ

Раніцай Яся і ягоных сяброў павялі да шыбеніцы, каб пакараць смерцю. «Як папярэдзіць хлопцаў, як папрасіць дапамогі?» — думаў Ясь. І тут у яго з’явілася ідэя. Калі панскія слугі падвялі хлопцаў да памоста, на якім стаяла шыбеніца, Ясь раптам моцна закрычаў. Сябры ўсё зразумелі і таксама падхапілі гэты заклік. Крык, узмоцнены рэхам, разнёсся па наваколлі. Атрад паспеў своечасова, і неўзабаве героі былі вызвалены. Сяляне прагналі паноў з гэтай зямлі. Ясь і Ядвіга пажаніліся.

З таго часу паселішча сталі называць Крычаў.

# Мінская вобласць



# Заслаўе

У старажытныя часы, калі нашы продкі яшчэ не ведалі хрысціянства, а былі язычнікамі і маліліся драўляным ідалам, у полацкага князя Рагвалода падрастала дачка Рагнеда — прыгожая і разумная дзяўчына. Аднойчы пасватаўся да яе наўгародскі князь Уладзімір. Адмовіла яму Рагнеда, таму што была заручана з ягоным братам — вялікім князем кіеўскім Яраполкам. Страшэнна раззлаваўся наўгародскі князь і захапіў Полацк, забіў на вачах у Рагнеды яе бацькоў і братоў, а князёўну вывез у Ноўгарад і прымусіў стаць ягонай жонкай. Пасля пайшоў з войскам на Кіеў, захапіў горад і забіў Яраполка.

Неўзабаве ў Рагнеды і Уладзіміра нарадзіўся сын, якога назвалі Ізяславам. Рагнеда хацела адпомсціць князю за бацькоў і братоў і, калі муж спаў, кінулася на яго з вострым нажом. Але Уладзімір раптоўна прачнуўся і выбіў зброю з яе рук. Княжацкія слугі схапілі Рагнеду. Яе чакала немінучая смерць. Але з мячом у руках наперад выйшаў маленькі Ізяслаў і сказаў:

— Спачатку, бацька, забі мяне, бо я выклікаю на бой любога, хто захоча пакрыўдзіць маю маці.

Такім чынам, у Рагнеды знайшоўся абаронца.

Тады князь Уладзімір загадаў пабудаваць драўляны замак у глухім кутку полацкай зямлі і адправіў туды Рагнеду разам з сынам. Пазней на тым месцы ўзнік горад, які назвалі ў гонар адважнага Ізяслава — Ізяслаўлем. Цяпер горад называецца Заслаўе.



ГАРАДЗІШЧА «ЗАМЭЧАК»


ГАРАДЗІШЧА
КАСЦЁЛ
СВЯТЫХ АПОСТАЛАЎ ПЯТРА І ПАЎЛА
Капыль
СПАСА-ЎШЭСЦЕЎСКАЯ ЦАРКВА

# Капыль

Калісьці вельмі даўно на тым месцы, дзе цяпер знаходзіцца горад Капыль, стаяў магутны замак, у якім жыў багаты князь. Непадалёк срэбрам блішчэла вялікае возера. Была ў князя дачка незямной прыгажосці. Князь не дазваляў Паліне (ці проста Полі) гуляць з сялянскімі дзяўчатамі і хлопцамі. І таму дзяўчына заўсёды сядзела ў святліцы, якая знаходзілася ў высокай вежы.

Аднойчы Поля раптам пачула гукі жалейкі: прыгожая, але трохі сумная мелодыя кранула душу князёўны. Поля пераапранулася ў сялянскае адзенне, непрыкметна прабралася каля стражнікаў і пабегла на бераг возера. Там яна ўбачыла маладога прыгожага пастуха з жалейкай. Статак быў непадалёку. Убачыўшы красуню, Коля (так звалі пастуха) адразу закахаўся ў яе. Коля і Поля дамовіліся, што ноччу яны прыйдуць сюды, каб пакатацца па возеры на чоўне...

Так яны сустракаліся кожную ноч. Калі князь даведаўся пра закаханых, то замкнуў дачку ў святліцы і абвясціў, што Поля неўзабаве стане жонкай багатага заморскага прынца. Дзяўчына зажурылася, пачуўшы гэта. Але аднойчы цёплай летняй ноччу, калі бушавала навальніца, Поля зноў пачула знаёмую мелодыю за акном. Дзяўчына зразумела: каханы кліча яе! Полі ўдалося выбрацца з замка, і яна кінулася да возера. На беразе яе ўжо чакаў Коля...

Князь, даведаўшыся пра ўцёкі дачкі, паклікаў усіх слуг і кінуўся ў пагоню. Апынуўшыся на беразе, ён убачыў на сярэдзіне возера човен і ў ім дзве постаці. Калі ж навальніца сціхла і трохі развіднела, там ужо нікога не было. Вада паглынула закаханых... У роспачы князь пракляў возера — і яно тут жа правалілася пад зямлю.

Пазней на гэтым месцы з'явілася вёска, якую назвалі ў гонар закаханых Ко-Поль (Коля і Поля), а потым — горад Капыль.


КАСЦЁЛ СВЯТОЙ ТРОЙЦЫ
КЛЕЦКІЯ КАЗАРМЫ
СТАРАЖЫТНЫ КЛЕЦАК
Клецк
ХРАМ УВАСКРЭСЕННЯ ХРЫСТОВАГА

# Клецк

Калісьці даўно жыў на свеце багаты і жорсткі князь. Часта, не разбіраючыся, вінаваты селянін або не, князь адразу загадваў слугам:

— У клець яго! На хлеб і ваду!

Таму і мянушку ён атрымаў адпаведную — Клецак.

Аднойчы Клецак убачыў сярод сялян дзяўчыну незвычайнай прыгажосці. «Ажанюся з ёю!» — адразу вырашыў князь. Ён загадаў, каб слугі схапілі дзяўчыну. Звалі яе Настуля.

Назаўтра князь абвясціў Настулі:

— Рыхтуйся, мілая Настуля. Праз два дні — наша вяселле!

Дзяўчына залілася слязьмі, кінулася на калені перад Клецакам:

— Не губі, княжа! У мяне ёсць каханы...

Князь не стаў слухаць бедную дзяўчыну.

— У клець яго! Рыхтуйся да вяселля! — крычаў Клецак.

— Не пайду я за цябе, княжа.— Настуля паднялася з кален. Твар яе палаў ад нянавісці.— Лепш у сырую зямельку, чым замуж за цябе!

— Ты не ведаеш, дзяўчо, што я ўсё на свеце магу! Вось зараз так тупну нагою, што расступіцца зямля! — закрычаў Клецак і што ёсць сілы тупнуў нагой.

І тут здарыўся сапраўдны цуд: Настуля раптам ператварылася ў белую галубку, якая вылецела праз акно між кратаў на волю! А князь разам са сваім замкам праваліўся пад зямлю... Яміну, што ўтварылася на тым месцы, людзі назвалі Клецакавай. Праз нейкі час тут паўстаў горад, назва якога цяпер вядома ўсім беларусам — Клецк.



БУДЫНАК БЫЛОГА ШПІТАЛЯ


ГАРАДСКАЯ РАТУША І ГАНДЛЁВЫЯ РАДЫ
СЛУЦКАЯ БРАМА
Нясвіж
НЯСВІЖСКІ ФАРНЫ КАСЦЁЛ
НАЙСВЯЦЕЙШАГА БОЖАГА ЦЕЛА
ЗАМКАВАЯ ВЕЖА

# Нясвіж

Было гэта вельмі даўно. Калісьці князь Радзівіл, пачынальнік магутнага роду, пабудаваў драўляны замак і выкапаў вакол яго глыбокі роў. Тады ўзнікла ў князя думка заснаваць непадалёк вялікі горад, не горшы за некаторыя еўрапейскія сталіцы. Але як яго назваць? Доўга думаў князь, але нічога цікавага ў галаву не прыходзіла. Тады Радзівіл выклікаў слугу і сказаў яму:

— Пойдзеш па дарозе. Якое слова першае пачуеш — тое і будзе назвай для новага горада.

Доўга крочыў слуга бязлюднай дарогай. Калі ён стаміўся і страціў апошнюю надзею сустрэць хоць каго-небудзь, то раптам убачыў чалавека, які нёс рыбу.

— Ці свежы ў пана карп? — спытаў слуга.

— Не свеж,— адказаў той.

Слуга вярнуўся ў замак і паведаміў князю, што першае слова, якое ён пачуў,— «не свеж».

Такім чынам горад, заснаваны князем Радзівілам, атрымаў назву Нясвіж.



НЯСВІЖСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ КОМПЛЕКС


ПАЛАЦ КУЛЬТУРЫ
1494 УЗДА 1494
Узда
ФРАГМЕНТ ГІСТАРЫЧНАЙ ГАРАДСКОЙ ЗАБУДОВЫ
СТЭЛА
ЦАРКВА СВЯТЫХ АПОСТАЛАЎ ПЯТРА І ПАЎЛА

# УЗДА

Шмат гадоў таму на нашу зямлю прыйшло незлічонае мангола-татарскае войска. Каля аднаго невялікіга паселішча пачалася бітва не на жыццё, а на смерць. Коні ў манголаў былі нізкарослыя, але вельмі жвавыя. У кожнага вершніка быў крывы меч і лук са стрэламі. Але нашы ваяры мужна змагаліся з ворагам. Яны не толькі адбілі атаку мангола-татараў, але і прымусілі іх кінуцца наўцёкі.

Хан Койдан, які быў на чале мангола-татарскага войска, убачыўшы, што яго ваяры ўцякаюць, кінуўся за імі. Але страла нашага лучніка дагнала яго. Адчуваючы, што смерць ужо блізка, хан Койдан спыніў каня. Падаючы з сядла, ён ухапіўся за ўзду і прамовіў:

— Вось дзе напаткала мяне смерць...

На гэтым месцы хан быў пахаваны. Над магілай насыпалі вялікі курган. Пазней непадалёк пачалі сяліцца людзі. Вёску (а потым і горад, які вырас тут) людзі назвалі Узда. А паселішча, каля якога адбылася бітва, атрымала назву Койданава.



КАСЦЁЛ УЗВЫШЭННЯ СВЯТОГА КРЫЖА



Навукова-папулярнае выданне

# ДЗІЦЯЧЫ АТЛАС БЕЛАРУСІ

*Легенды і паданні*

Тэкст, укладанне Дзмітрыя Пятровіча

0+

Рэдактар *В. А. Шніп*
Мастацкі рэдактар *В. А. Макаранка*
Арыгінал-макет *У. М. Жук*
Стылістычны рэдактар *Ю. В. Тыркіч*

Падпісана да друку 21.12.2018. Фармат 60 x 90 1/8. Папера афсетная.
Гарнітура PragmaticaC. Друк афсетны. Ум. друк. арк.7,0. Улік.-выд. арк. 5,03.
Тыраж 1000 экз. Заказ 6464.

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/5 ад 09.07.2013.
Пр-т Пераможцаў, 11, 220004, Мінск. www.mastlit.by; e-mail: mail@mastlit.by

«ГРАДЫЕНТ»®. ТАА «НАВІТЭХ».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/194 ад 23.02.2017.
Вул. Бабушкіна, 6а, 220024, Мінск.



*Помнік Адаму Міцкевічу*
*Навагрудак*
*(Гродзенская вобл.)*

Ці добра ведаем мы гісторыю і геаграфію нашай краіны? Далёка не кожны з нас адкажа на гэтае пытанне станоўча. Адкуль, напрыклад, паходзяць назвы ўсіх абласных цэнтраў і некаторых іншых гарадоў Беларусі, а таксама рэк і азёр? З якімі знакавымі асобамі звязаны пэўныя мясціны? Якія архітэктурныя помнікі павінен ведаць кожны беларус? На гэтыя і іншыя пытанні можна адказаць, прачытаўшы кнігу «Дзіцячы атлас Беларусі. Легенды і паданні», героямі якой з'яўляюцца не толькі міфічныя персанажы (асілак Менеск, разбойнік Машэка, селянін Добруш, князь Альшан), але і рэальныя гістарычныя асобы (Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, княгіня Рагнеда, князі Ізяслаў, Уладзімір, Радзівіл і іншыя). Кніга адрасавана найперш дзецям і дарослым, якія цікавяцца гісторыяй Беларусі і любяць адкрываць для сябе нешта новае.

0+

ISBN 978-985-02-1870-4